Навукова-метадычны часопіс
Выдаецца штомесячна,
з II паўгоддзя 2011 года
Зарэгістраваны ў Міністэрстве
інфармацыі Рэспублікі Беларусь
Пасведчанне ад 25.04.2011 № 1440

АіВ
Адукацыя і выхаванне
выдавецтва

Серыя «У дапамогу педагогу»
заснавана ў 1995 годзе

# Гісторыя і грамадазнаўства

№ 5 (47) 2015

Заснавальнік і выдавец —
РУП «Выдавецтва
"Адукацыя і выхаванне"»
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь

Вул. Будзённага, 21,
220070, г. Мінск;
тэл.: 297-93-20 (адк. сакратар),
297-93-22 (аддзел маркетынгу),
факс: 297-91-49
e-mail: history@aiv.by,
http://www.aiv.by



РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

Мікалай Іосіфавіч МІНІЦКІ — галоўны рэдактар, доктар гістарычных навук, прафесар
П. Р. МАРТЫСЮК — першы намеснік галоўнага рэдактара, доктар філасофскіх навук, дацэнт
Н. М. ГАНУШЧАНКА — намеснік галоўнага рэдактара, кандыдат гістарычных навук
Л. В. САЛАМАХА — адказны сакратар
Л. В. ЖЭРКА
В. М. ВАРАНОВІЧ
С. А. КУДРАЎЦАВА
Л. І. ШЧЭНІКАВА

РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА

В. У. ПАЗНЯКОЎ — старшыня рэдакцыйнай рады, доктар філасофскіх навук, прафесар
Я. М. БАБОСАЎ, доктар філасофскіх навук, прафесар, акадэмік
С. А. БАЛАШЭНКА, доктар юрыдычных навук, прафесар
В. В. БУШЧЫК, доктар палітычных навук, прафесар
П. А. ВАДАП'ЯНАЎ, доктар філасофскіх навук, прафесар
М. І. ВІШНЕЎСКІ, доктар філасофскіх навук, прафесар
В. В. ДАНІЛОВІЧ, кандыдат гістарычных навук, дацэнт
М. М. ЗАБАЎСКІ, доктар гістарычных навук, прафесар
А. А. КАВАЛЕНЯ, доктар гістарычных навук, прафесар
В. А. КАПРАНАВА, доктар педагагічных навук, прафесар
П. С. КАРАКА, доктар філасофскіх навук, прафесар
Г. У. КАРЗЕНКА, доктар гістарычных навук, прафесар
І. В. КАРПЕНКА
Г. А. КОСМАЧ, доктар гістарычных навук, прафесар
У. С. КОШАЛЕЎ, доктар гістарычных навук, прафесар
М. А. МАЖЭЙКА, доктар філасофскіх навук, прафесар
С. В. ПАНОЎ, кандыдат педагагічных навук, дацэнт
С. В. РАШЭТНІКАЎ, доктар палітычных навук, прафесар
С. М. ХОДЗІН, кандыдат гістарычных навук, дацэнт
І. І. ЦЫРКУН, доктар педагагічных навук, прафесар

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

РЭЦЭНЗІІ

# Рэцэнзія на манаграфію В. А. Пілецкага «Выхаваўча-адукацыйны працэс у гісторыі Беларусі дахрысціянскага перыяду»*

Даследаванне праблемы генезісу выхаваўча-адукацыйнага працэсу на беларускіх землях у дахрысціянскі перыяд уяўляе сабой даволі актуальную для сучаснай навукі задачу. Яе мэта — вывучыць гістарычна-пачатковы этап станаўлення практыкі перадачы вопыту як асобнай сферы жыццядзейнасці грамадства для высвятлення вытокаў сучасных сацыякультурных працэсаў. Манаграфія загадчыка кафедры гісторыі і тэорыі права Мінскага ўніверсітэта кіравання, доктара гістарычных навук, дацэнта В. А. Пілецкага ў сувязі з вышэйсказаным уяўляецца асабліва актуальнай. Яна прысвечана высвятленню паходжання, узнікнення, развіцця і станаўлення да ўзроўню асобнай сацыяльна-гістарычнай з'явы выхаваўча-адукацыйнага працэсу на беларускіх землях у дахрысціянскі перыяд.

Важна і тое, што аналізуемая праца ліквідуе прабел у айчыннай гістарыяграфіі, пры якім праблема перадачы вопыту ў гісторыі беларускіх зямель да канца X ст. (часу прыняцця хрысціянства) практычна не вывучалася. Гэта было абумоўлена, галоўным чынам, спецыфікай дзяржаўніцкага падыходу да аналізу гістарычнага мінулага. Манаграфія В. А. Пілецкага зыходзіць з адзінства працэсу перадачы вопыту ў грамадстве на працягу ўсёй гісторыі ад старажытнасці да сучаснасці, незалежна ад дзяржаўнага, этнічнага, рэлігійнага і іншых статусаў краіны. Яна даказвае, што выхаваўча-адукацыйны працэс (як з'ява) на працягу гісторыі заставаўся нязменным. На працягу асобных фармацый, цывілізацый, гістарычных эпох і перыядаў змяняліся толькі яго формы, метады і змест у залежнасці ад ступені развіцця грамадства.

Падчас даследавання аўтар вырашыў важныя тэарэтычныя задачы, якія раскрылі сутнасць сфармуляванай праблемы. Так, напрыклад, выяўлены пачатак зараджэння выхаваўча-адукацыйнага працэсу ў гісторыі беларускіх зямель; паказана матывацыя з'яўлення практыкі перадачы вопыту насельніцтвам перыяду праабшчыны; ахарактарызаваны формы, змест і механізмы трансляцыі вопыту падчас родавага ладу; даследавана роля тайных саюзаў у выхаваўча-адукацыйным працэсе як своеасаблівых сацыяльна-палітычных структур, што стыхійна ўзнікалі на пераломе матрыярхальнай і патрыярхальнай эпох і вялі барацьбу за ўсталяванне патрыярхату; вызначаны змест выхавання і напрамкі вопыту, якія перадаваўся дзецям пры падрыхтоўцы іх да дарослага жыцця ў дахрысціянскім грамадстве, і інш.

Нельга лічыць, што ў аналізуемай манаграфіі ўсё канчаткова даказана і абгрунтавана. Выклікае пытанні, напрыклад, сцвярджэнне аўтара пра магчымасці неандэртальца навучаць сваіх дзяцей. Можна спрачацца аб матывацыі, характары і часе з'яўлення ініцыяцыйнай абраднасці ў першабытных людзей на тэрыторыі Беларусі. Можна задаваць і некаторыя іншыя пытанні. Разам з тым нельга не адзначыць, што тэматыка праведзенага даследавання выключна наватарская. У выніку вывучэння праблемы, праведзенага ў розных крыніцах, паказана пераканаўчая карціна пачатковага этапу станаўлення

* Мінск: Ковчег, 2013. — 372 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

выхаваўча-адукацыйнай практыкі ў грамадстве, якое пражывала на землях сучаснай Беларусі. Аўтар не пабаяўся ўзяцца за вывучэнне пытанняў, многія з якіх увогуле не былі абазначаны навуковай грамадскасцю ў якасці перспектыўных для даследавання, не гаворачы нават аб іх вывучэнні.

У пэўнай ступені манаграфія адлюстравала аўтарскае бачанне вызначанай праблематыкі. У дачыненні да некаторых аспектаў яно дыскусійнае, але, без сумневу, патрэбнае і актуальнае для сучаснай навукі. Тым больш вядома, што фармуляванне гіпотэз у тых ці іншых галінах навукова-даследчай практыкі часта не менш карыснае, чым атрыманне адказу на пастаўленыя пытанні. Развіццё навукі ў будучым, несумненна, вырашыць гэтыя праблемы і дазволіць грамадству прасунуцца наперад у адпаведнай галіне пазнання. Аўтар змог на высокім навуковым узроўні сфармуляваць новыя для гісторыка-педагагічнай навукі праблемы. Прычым большасць з іх ён удала вырашыў, абапіраючыся на розныя гістарычныя і іншыя крыніцы.

Змест манаграфіі, мяркуючы па прадстаўленым на рэцэнзію матэрыяле, вытрыманы ў даследчыцкім стылі. Высновы і абагульненні грунтуюцца на шырокім спектры крыніц і фактaлагічных даных. План работы рознабакова асвятляе праблему. Інфармацыйна-даведачны апарат і іншыя неабходныя параметры адпавядаюць патрабаванням ВАК Рэспублікі Беларусь, якія прад'яўляюцца да навукова-манаграфічных даследаванняў.

Аўтар выкарыстаў шматлікія групы гістарычных крыніц і даказаў, што на беларускіх землях таксама адбываўся працэс генезісу (зараджэння і станаўлення) выхаваўча-адукацыйнай практыкі. Тут была свая храналогія фарміравання і станаўлення тых ці іншых працэсаў у названай галіне. Былі свае асаблівасці іх выяўлення і пэўная спецыфіка сутнасці, асобныя аспекты якой фарміраваліся з часоў глыбокай старажытнасці пад уплывам кліматычных, этнічных і іншых фактараў.

Манаграфія напісана на добрай беларускай мове з улікам неабходных патрабаванняў для падобнай літаратуры. Прысутнічае тэкставая частка, дзе засяроджаны асноўны змест даследаванай праблемы. Ёсць падрабязны аналіз гістарыяграфіі і крыніц, пад якія адведзены асобныя часткі кнігі. Сфарміраваны і правільна аформлены (у адпаведнасці з патрабаваннямі ВАК Рэспублікі Беларусь) даведачна-бібліяграфічны апарат; маецца даволі шырокі спіс выкарыстанай літаратуры, які ўключае больш за 900 найменняў. Ён дае выдатную магчымасць (пры неабходнасці) значна пашырыць і паглыбіць вывучэнне тых ці іншых аспектаў даследаванай праблематыкі шляхам прыцягнення разнастайнай літаратуры, якая так або інакш звязана з гістарычнай эвалюцыяй выхаваўча-адукацыйнага працэсу.

План манаграфіі складаецца з 6 глаў, якія, у сваю чаргу, падзелены на асобныя сэнсавыя часткі. Ён даволі поўна асвятляе розныя бакі аналізаванай праблемы. Тут лагічна і паслядоўна раскрываецца спецыфіка зараджэння і станаўлення выхаваўча-адукацыйнага працэсу на беларускіх землях у старажытным і раннесярэдневяковым перыядах. Дадзена глыбокае навуковае тлумачэнне тэрміна «выхаваўча-адукацыйны працэс», паказана яго спецыфіка ў параўнанні з блізкімі яму навукова-гістарычнымі катэгорыямі. Асветлены праблема месца і ролі дзяцей у эпоху раннеродавага грамадства, а таксама асаблівасці зараджэння ініцыяцыйнай абраднасці як адной з першых форм перадачы грамадскага досведу новым пакаленням у гісторыі.

Праведзены глыбокі аналіз гістарыяграфіі праблемы, які ўключае не толькі гістарычныя працы, але і даследаванні навукоўцаў педагагічнага профілю, этнаграфічныя, філасофскія, псіхалагічныя і іншыя працы. Усе яны, нягледзячы на розныя спецыялізацый, пераканаўча сведчаць аб пэўнай эвалюцыі поглядаў прадстаўнікоў сусветнай навукі на гэту праблему.

Асобная частка манаграфіі прысвечана крынічнай базе даследавання праблемы. Тут паказаны розныя групы гістарычных, этнаграфічных, археалагічных і іншых матэрыялаў, якія ў той ці іншай ступені сведчаць аб наяўнасці практыкі перадачы вопыту ў гісторыі грамадства ў цэлым і старажытнага насельніцтва тэрыторыі Беларусі ў прыватнасці.

*У. В. Тугай, доктар гістарычных навук, прафесар*



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ